УДК 940.5(438)

**К.В. Лаўрыненка**

# Касцёл і «Салідарнасць» (1980-1981 гг.)

У айчыннай гістарыяграфіі ўдзел Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР з'яўляецца фактычна недаследаваным. У сваім артыкуле аўтар спрабуе прааналізаваць адзін з аспектаў дзейнасці Касцёла ў 1980-я гг. – яго адносіны з «Салідарнасцю».

Жнівень 1980 г. абудзіў да грамадска-палітычнай дзейнасці ўсе слаі польскага грамадства, што прывяло да ўзнікнення Незалежнага Самакіраўнічага Прафсаюза «Салідарнасць». Пры гэтым ён не быў класічным прафсаюзам – хутчэй вельмі шырокім грамадскім рухам, колькасны рост якога быў беспрэцэдэнтным у сусветнай гісторыі – у перыяд з верасня 1980 г. па сакавік 1981 г. у яго шэрагі ўступіла (паводле розных ацэнак) ад 8 да 10 млн. чалавек. Гэта, а таксама пазіцыя «Салідарнасці», якая змагалася не толькі за інтарэсы і правы працоўных, але і Касцёла, вызначыла прыхільнае стаўленне Касцёла да «Салідарнасці». Варта прыпомніць і тое, што ад самага пачатку ўтварэння прафсаюзаў у XIX ст. Касцёл падтрымаў гэтыя імкненні рабочых. Першапраходцам быў біскуп Вільгельм фон Кэтэлер (1811-1877), які лічыў, што для абароны сваіх правоў рабочыя павінны ствараць прафсаюзы. Гэтая канцэпцыя аўтаномных прафсаюзаў, акрэсленая біскупам фон Кэтэлерам, ад пачатку пантыфікату Папы Льва XIX, знайшла сваё адлюстраванне ў найважнейшых дакументах Касцёла – энцыкліках «Rerum novarum (1891)», «Qaudragesimo anno» (1931), «Mater et Magistra» (1961), «Popolorum progressio» (1967), апостальскім лісце «Octogesima adrenienus» (1971) і пастырскай канстытуцыі аб Касцёле ў сучасным свеце «Gaudium et spes».

Трэба адзначыць, што Каталіцкі Касцёл выразна падтрымаў пратэсты рабочых ў жніўні 1980 г. Гэта прывяло да ўзмацнення іх пазіцыі і ў выніку – да ўтварэння «Салідарнасці». Падчас забастовак да Леха Валенсы паступіла прапанова ад Прымаса аб спатканні. Сама сустрэча адбылася 6 верасня 1980 г. і была прысвечана абмеркаванню сітуацыі. Наступныя спатканні дзеячаў «Салідарнасці» з прадстаўнікамі вышэйшай касцёльнай іерархіі адбываліся ў асноўным для падтрымкі прафсаюза Касцёлам у вачах грамадства і ўладаў. Так, Касцёл рашуча падтрымаў «Салідарнасць» у перыяд «крызісу рэгістрацыі» прафсаюза. У кастрычніку ў камюніке 176-й Пленарнай Канферэнцыі Біскупату Польшчы сцвярджалася, што да асноўных правоў асобы належаць: «права рабочых на свабоднае ўтварэнне саюзаў, якія б сапраўды прадстаўлялі іх правы, а таксама права кожнага рабочага на свабодны ўдзел у дзейнасці гэтых саюзаў» [1]. Гэтыя словы пацвярджалі прыхільную пазіцыю Біскупату ў адносінах да «Салідарнасці». Папа, які ў публічных выступленнях звычайна быў больш чым стрыманы, праз пасрэдніцтва Прымаса Вышыньскага накіраваў 8 лістапада неадкладную просьбу да кіраўніцтва «Салідарнасці» «аб большай цярплівасці і памяркоўнасці» [2]. Няма сумнення, што заклік Папы паўплываў на сканчэнне кампрамісам судовай справы рэгістрацыі «Салідарнасці».

10 лістапада кардынал Вышыньскі спецыяльна вярнуўся з Рыма, каб узняць голас у абарону «Салідарнасці» ад імя Каталіцкага Касцёла. У той жа дзень Найвышэйшы Суд зарэгістраваў НСПС «Салідарнасць», і Прымас Вышыньскі прыняў у сябе яе прадстаўнікоў. Пасля афіцыйнай часткі сустрэчы адбылося кароткае неафіцыйнае спатканне Прымаса і Валенсы. Як успамінае дарадца Прымаса Р. Кукаловіч, Прымас прапанаваў Валенсу выезд у Маскву

для прызнання ёй прафсаюза. Але Валенса адмовіўся [3]. Сам жа Прымас Вышыньскі нібыта лічыў, што калі Масква не прызнае «Салідарнасць», то прафсаюз не будзе доўга існаваць, прызнанне ж Масквой «Салідарнасці» дало б важны аргумент у размовах з уладамі ў Варшаве, якія мелі б цяжкасці ў ліквідацыі арганізацыі. Аднак ні сам Валенса, ні біёграфы Вышыньскага ніколі не ўзгадвалі пра падобнага роду прапанову.

Апроч спатканняў з Прымасам, прадстаўнікі прафсаюза неаднаразова сустракаліся з біскупамі сваіх дыяцэзій, існавала супрацоўніцтва з парафіяльнымі душпастарамі. У многіх рэгіёнах «Салідарнасці» дапамагалі эксперты, якіх рэкамендавалі дыяцэзіяльныя курыі. Орган Прэс-бюро Біскупату Польшчы «Pismo Okólne» за 1980-1981 гг. неаднаразова паведамляў аб адпраўленні рэлігійных службаў за «Салідарнасць» на тэрыторыях прадпрыемстваў і пасвячэнні яе штандараў. Біскупы запрашаліся на прадпрыемствы для спатканняў з рабочымі, афіцыйныя дэлегацыі прафсаюза ўдзельнічалі ў важнейшых касцёльных урачыстасцях. І ўсё ж адносіны «Салідарнасці» з Касцёлам не трэба разглядаць выключна ў аспекце рэлігійных маніфестацый і дэманстрацыйных візітаў. З аднаго боку, пры распрацоўцы праграмы дзеяння «Салідарнасць» карысталася з грамадскага навучання Касцёла, з другога боку, прафсаюз неаднаразова выказваў клопат аб правах Касцёла. Цесныя сувязі паміж Касцёлам і «Салідарнасцю» і іншымі незалежнымі арганізацыямі не азначалі, аднак, тоеснасці іх інтарэсаў і палітыкі. Інтарэсы Касцёла і надалей заключаліся хутчэй у рэалізацыі духоўнай і рэлігійнай місіі, чым у непасрэдным удзеле ў палітычных справах, у той час як інтарэсы незалежных груповак былі матываваныя грамадска-палітычнымі праблемамі. Больш таго, яны імкнуліся выкарыстаць Касцёл у сваіх мэтах, а той, у сваю чаргу, усяляк гэтаму супраціўляўся. Той жа Валенса быў глыбока веруючым і практыкуючым каталікам, які кожны дзень наведваў імшу і прыступаў да прычасця, але пры гэтым выдатна ўмеў выкарыстоўваць у палітычных мэтах набажэнствы і малітвы. Прынцыповыя адрозненні ў гэтых падыходах стваралі перашкоду для ўсталявання цеснай сувязі паміж Касцёлам і прафсаюзам. Касцёл праводзіў свядомую палітыку адасаблення сваёй працы ад дзейнасці грамадскіх груповак, лічачы, што сталая сувязь між абодвума бакамі сур'ёзна адбілася б на яго рэлігійнай місіі. Аднак змест практычна ўсіх камюніке Пленарных Канферэнцый Біскупату Польшчы за перыяд легальнага існавання «Салідарнасці» сведчыць аб прыхільных адносінах Біскупату да прафсаюза. Аб прыхільных адносінах і імкненні да супрацоўніцтва сведчыць і тое, што 9 снежня 1980 г. Біскупатам было ўтворана «Аб'яднанне для распрацоўкі праблем у сферы грамадскай каталіцкай навукі для прафсаюзнага руху пры Сакратарыяце Біскупату Польшчы», каб дапамагчы ва ўтварэнні ідэйнай платформы новага прафсаюза на падставе рэлігійнай і нацыянальнай традыцыі. Але пры ўсёй сваёй прыхільнасці да новапаўсталага прафсаюза, Прымас імкнуўся кантраляваць яго дзейнасць. Пацвярджае гэта наступны факт: пасля першай размовы з Прымасам Валенса спаткаўся з ксяндзом Аршулікам, які ўваходзіў у групоўку Прымаса, пасля чаго Валенса заявіў Яцэку Куроню, эксперту ад КАРу, каб той больш не паказваўся ў памяшканні Міжзаводскага Забастовачнага Камітэта. Куронь лічыў, што гэта было зроблена пад уплывам ксяндза Аршуліка. Як бачна, некаторыя прадстаўнікі вышэйшай іерархіі Касцёла імкнуліся ўплываць на дзейнасць кіраўніцтва «Салідарнасці», падтрымліваючы адных і выказваючы незадаволенасць іншымі. Што ж датычыцца радавога каталіцкага духавенства, то яно практычна цалкам падтрымлівала «Салідарнасць» – вельмі многія яго прадстаўнікі бралі ўдзел у справах прафсаюза і, такім чынам, у палітычнай дзейнасці. Вынікам такой актыўнасці стаў пункт 4 камюніке Пленарнага пасяджэння Канферэнцыі Біскупату (сакавік 1981 г.), які нагадваў каталіцкаму духавенству аб тым, што палітычная дзейнасць з'яўляецца задачай свецкіх католікаў [4]. Ад часу

кіравання Прымаса Глемпа падтрымка шараговым каталіцкім духавенствам «Салідарнасці» была ўсё больш яўнай, але Глемп асабіста блакаваў падобнага роду актыўнасць.

Аб прыхільных адносінах Касцёла і «Салідарнасці» сведчыць і тое, што сваю першую замежную паездку Валенса здзейсніў у Рым, каб асабіста падзякаваць Папу за падтрымку прафсаюза.

Візіт у Ватыкан вельмі ўзмацніў «Салідарнасць», асабліва на міжнароднай арэне. Сустрэчы з Папам адбыліся 15 і 18 студзеня. Падчас першай сустрэчы прысутнічала шмат журналістаў з многіх краін. Дэлегацыя «Салідарнасці» была прынята Папам Янам Паўлам II у прысутнасці Камітэта ў справах Сталых Рабочых кантактаў з Апостальскай Сталіцай, які часова выконваў функцыю рэпрэзентацыі дзяржаўных улад ПНР у Ватыкане, дзякуючы чаму быў падкрэслены паўнапраўны характар новага прафсаюза. Тон і змест прамовы Папы, якая была акрэслена як «малы трактат маральных прынцыпаў прафсаюзнага руху» [5], яскрава сведчыў аб больш чым прыхільным стаўленні яго да «Салідарнасці».

19 студзеня дэлегацыя «Салідарнасці» вярнулася ў Польшчу і адразу была прынята Прымасам, які станоўча ацаніў візіт. Яго прамова ўтрымлівала шэраг пунктаў, якія датычыліся накірункаў далейшай працы і дзейнасці руху [6]. Пасля афіцыйнай часткі адбылося спатканне Прымаса і Валенсы.

Варта, аднак, звярнуць увагу на той факт, што ў студзені 1981 г. Валенса першы і апошні раз знаходзіўся ў Рыме па запрашэнні Папы. Адбылося гэта ў сувязі з тым, што Валенса не здолеў пераадоліць спакусу сустрэцца ў Рыме яшчэ і з прадстаўнікамі італьянскіх прафсаюзаў (дэлегацыя «Салідарнасці» мела два запрашэнні ў Італію: Папы і італьянскіх прафсаюзаў). Той жа Прымас 15 студзеня падчас сустрэчы з ксяндзамі-дэканамі Варшаўскай архідыяцэзіі выказаў сваё незадавальненне тым, што дэлегацыя «Салідарнасці» сустракалася з італьянскімі прафсаюзамі. Усе наступныя разы Валенса выязджаў у Рым па запрашэнні іншых асоб і пры той аказіі яго прымаў Папа.

Аднак пры такіх сувязях Касцёла і «Салідарнасці», Касцёл толькі адзін раз умяшаўся ў яе канфлікт з уладай. Адбылося гэта ў сувязі з інцыдэнтам у Бельска-Бялэй, калі рабочыя пачалі забастоўку, патрабуючы звальнення мясцовай адміністрацыі разам з ваяводам. Забастоўка пачалася ў канцы студзеня 1981 г. і цягнулася каля 10 дзён, агарнуўшы ўвесь рэгіён. Перамовы зайшлі ў тупік. У гэты час Валенса папрасіў сваіх дарадцаў, каб тыя звярнуліся да Касцёла па дапамогу. Адбылося некалькі кансультацый паміж біскупамі, кардыналам Вышыньскім і «высокапастаўленымі» палітычнымі дзеячамі. У выніку біскуп Браніслаў Дамброўскі далучыўся да перамоў і гарантаваў ад імя Касцёла, што абавязацельствы як рабочых, так і ўрада будуць выкананы. Канфлікт быў вырашаны.

Вельмі сур'ёзна адрэагаваў Касцёл на «быдгаскі крызіс». 28 сакавіка 1981 г. ужо хворы Прымас прыняў дэлегацыю «Салідарнасці» на чале з Валенсам. Вышыньскі пераконваў дэлегацыю ў неабходнасці мірнага ўрэгулявання «быдгаскага канфлікту». Аб тым, наколькі сур'ёзным быў канфлікт, сведчыць і хваляванне Папы ў гэтай сітуацыі. 28 сакавіка ён накіраваў тэлеграму Прымасу, у якой выказаў занепакоенасць сітуацыяй [7]. На наступны дзень у сваёй прамове Папа зноў узгадаў аб «быдгаскім канфлікце» і паўтарыў, што «палякі маюць выключныя правы для пераадолення сваіх унутраных грамадска-эканамічных цяжкасцей сваімі сіламі» [8]. Зразумела, што Папа меў на ўвазе недапушчальнасць у ПНР савецкай інтэрвенцыі. Праз некалькі тыдняў пасля «быдгаскага канфлікту» шмат дзеячаў крытыкавала вельмі памяркоўную пазіцыю Касцёла і яго ўплыў звыш меры на Валенсу і яго дарадцаў.

Пасля смерці Прымаса Вышыньскага ў маі 1981 г. адносіны паміж Касцёлам і «Салідарнасцю» змяніліся. Дзеячы «Салідарнасці» ўсё часцей атакуюць

блізкіх Касцёлу дарадцаў. Новы Прымас, арцыбіскуп Глемп, стараўся адасобіць інтарэсы Касцёла і прафсаюза. Пацвярджае гэта і той факт, што першая сустрэча Глемпа і Валенсы адбылася толькі 22 ліпеня. Як падае камюніке Сакратарыяту Прымаса, сустрэча мела характар знаёмства [9], аднак сведчыла аб далейшым супрацоўніцтве Касцёла і «Салідарнасці».

Самі дзеячы «Салідарнасці» выразна дэманстравалі незалежнасць сваёй пазіцыі ад Касцёла, а таксама нежаданне яго непасрэднага ўмяшальніцтва ў палітычныя справы. Нават Валенса, які найчасцей з кіраўніцтва «Салідарнасці» падкрэсліваў свае рэлігійныя перакананні, першы супрацівіўся хрысціянска-дэмакратычнай канцэпцыі развіцця руху. Але тлумачыцца гэта хутчэй тым, што Валенсу прыходзілася лічыцца з той часткай кіраўніцтва прафсаюза, якая была няверуючай, і ніколі не згадзілася б на гэта.

Свае адносіны да «Салідарнасці» Прымас Глемп выразіў у чэрвені 1981 г.: «Касцёл гатовы выступіць у абарону «Салідарнасці» ў выпадку парушэння... правоў чалавека. Касцёл (...) не жадае апанаваць «Салідарнасць», але зацікаўлены рэлігійнай пазіцыяй яе членаў» [10]. Менавіта Прымас Глемп прачытаў пропаведзь падчас імшы, якая была праведзена на адкрыцці Агульнанацыянальнага з'езду «Салідарнасці» 5 верасня 1981 г. у Гданьску. Прысутнасць Глемпа на з'ездзе выклікала вялікую незадаволенасць уладаў. Аднак гэтым удзел Касцёла не абмежаваўся. За падзеямі сачыў біскуп Качмарэк, а пасля абрання Валенсы на пасаду старшыні прафсаюза на пасяджэнні Сумеснай камісіі прадстаўнікоў урада і Біскупату касцёльны бок пацвердзіў, што падтрымлівае Валенсу і тых, хто з ім супрацоўнічае [11]. Нягледзячы на такія заявы, дыстанцыя паміж Касцёлам і «Салідарнасцю» павялічвалася. У кастрычніку Прымас публічна крытыкаваў вынікі з'езду і саму «Салідарнасць». Аднак не азначала гэта поўнай адасобленасці абодвух бакоў. Удзел у спатканні «вялікай тройкі» Ярузельскі-Валенса-Глемп Валенса узяў пад уплывам Касцёла. Не перарываліся і кантакты. Менавіта да Прымаса звярнуліся лідэры «Салідарнасці», калі стала вядома, што на пасяджэннях 27-28 лістапада VI Пленум ЦК ПАРП абавязаў свой Дэпутацкі Клуб прадставіць на пасяджэнне Сейма праект статута «Аб надзвычайных сродках дзеянняў у інтарэсе абароны грамадзян і дзяржавы», які даў бы дзяржаўнаму кіраўніцтву магчымасць увядзення ваеннага становішча. Для «Салідарнасці» гэта азначала ліквідацыю ўсіх заваяванняў жніўня 1980 г. Такім чынам, у распараджэнні лідэраў прафсаюза засталася адзіная магчымасць супраціўлення – пагроза 24-гадзіннай забастоўкі, калі б гэты закон быў абмеркаваны, і ўсеагульнай бестэрміновай забастоўкі пры ўмове прыняцця яго Сеймам. Сустрэчы старшыні «Салідарнасці» Валенсы і яго дарадцаў з Прымасам Глемпам адбыліся 5, 7, 9 снежня. Прадметам размоў было пасяджэнне Усепольскай Камісіі «Салідарнасці», прызначанае на 11 снежня, дзе была б вызначана пазіцыя прафсаюза ў той сітуацыі, бо Прымас імкнуўся да захавання спакою ў грамадстве. Адна з сустрэчаў адбылася ў сувязі з паведамленнем, нібыта атрыманым ад Анджэя Міцэўскага, дарадцы Прымаса, які паведаміў, што, паводле яго крыніц, канфлікт у Польшчы павінен быць вырашаны да 15 снежня. Міцэўскі сцвярджаў, што перадаў касцёльным уладам інфармацыю аб магчымым увядзенні ваеннага становішча [12]. Маюцца, аднак, і супрацьлеглыя звесткі, што Біскупат не меў магчымасці паведаміць прафсаюзу аб намеры ўладаў увесці ваеннае становішча, бо папросту не меў такой інфармацыі. Вельмі істотным крокам Прымаса ў гэтай сітуацыі было дасланне 6 снежня ліста да маршалка Сейма Гуцвы, у якім ён перасцерагаў ад ухвалення статута аб наданні надзвычайных паўнамоцтваў ураду, што, на яго думку, справакавала б агульную забастоўку. Наступным крокам Прымаса па прадухіленні трагічных падзей у краіне быў ліст, накіраваны да старшыні «Салідарнасці» 8 снежня, у якім ён заклікаў да дыялогу ў атмасферы спакою.

Але, нягледзячы на ўсе намаганні Прымаса па прадухіленні ваеннага становішча, спыніць працэс аказалася немагчымым. У выніку абвяшчэння ваеннага становішча дзейнасць «Салідарнасці» была забаронена.

Такім чынам, у адносінах Касцёла і «Салідарнасці» можна вылзеліць два перыяды: першы – гэта час прымасоўства кардынала Вышыньскага. Прымас Вышыньскі прыхільна ставіўся да новапаўсталага прафсаюза, пры гэтым ён імкнуўся кантраляваць яго дзейнасць. Але, нягледзячы на прыхільныя адносіны, кожны бок меў свае інтарэсы. Пасля смерці Вышыньскага адносіны паміж Касцёлам і «Салідарнасцю» змяняюцца – усё больш павялічваецца дыстанцыя між абодвума бакамі. Што ж датычыцца шараговага каталіцкага духавенства, то яно ўвесь перыяд легальнага існавання «Салідарнасці» актыўна яе падтрымлівала. Саюз «Салідарнасці» і Касцёла быў рэалізаваны ў супольнай барацьбе за вызваленне грамадства ад таталітарнага ўціску партыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Komunikat ze 176 Konferencji Plenarnej Episkopatu*** // L'Osservatore Romano. 1980. № 9. S. 22.
2. ***Stechle H.*** Tajna dyplomacja Watykanu. Papiestwo wobec komunizmu (1917-1991) W., 1993. S. 309.
3. ***W cieniu Prymasa Tyciąclecia.*** Z Romualdem Kukołowiczem rozmawia Piotr Bączek. W., 2001. S. 158.
4. ***Komunikat ze 178 Konferencji Plenernej Episkopatu Polski*** // L'Osservatore Romano, 1981, № 3. S. 24.
5. ***Nie przeciwko komukolwiek lecz ku wspólnemu dobru. Jan Paweł II do delegacji «Solidarności»***// L'Osservatore Romano. 1981. № 1. S. 22.
6. Przemówienie kard. S. Wyszyńskiego wygłoszone do delegacji NSZZ «Solidarność». 19 stycznia 1981, Warszawa // Kościół w PRL. Kościół Katolicki a państwo w świetle dokumentów 1945-1989. T. 3. Lata 1975-1989. Poznań – Pelplin: W drodze – Bernardinum, 1996. S. 201-202.
7. List Papieża Jana Pawła II do Prymasa kard. S. Wyszyńskiego wyrażający troską o sprawy Ojczyzny. 28 marca 1981, Watykan // Kościół w PRL. Kościół Katolicki a panstwo w świetle dokumentów 1945-1989. T. 3. Lata 1975-1989. Poznań – Pelplin: W drodze – Bernardinum, 1996. S. 213-214.
8. ***Jan Paweł II.*** Polacy mają wyłączne prawo... // L'Osservatore Romano. 1981. № 3. S. 24.
9. Komunikat Sekretariatu Prymasa Polski o wizycie przewodniczącego NSZZ Solidarność L. Wałęsy u Prymasa abp. J. Glempa // Kościół w PRL. Kościół Katolicki a państwo w świetle dokumentów 1945-1989. T. 3. Lata 1975-1989. Poznań – Pelplin: W drodze – Bernandinum, 1996. S. 229.
10. ***Spotkanie w Olsztynie. Rozmowa z Ks. Biskupem Józefem Glempem, ordynariuszem diecezji warmińskiej*** // Tygodnik Powszechny. 1981. 25 czerwca. S. 1, 5.
11. ***Relacja z posiedzenia Komisji Wspólnej przedstawicieli rządu i Episkopatu w dniu 9 października 1981 r.*** // Tajne dokumenty Państwo – Kościół 1980-1989 L., 1993. S. 118-119.
12. ***Micewski A.*** Kościół ostrzegał «Solidarność» // Znaki czasu, 1987, № 3. S. 167.



## SUMMARY

*The article deals with the relations of the Catholic Church and the independent trade union «Solidarity» of the Republic of Poland. In the article different stages of the interrelation of the Catholic Church and the «Solidarity» are analyzed, their characteristic peculiarities are revealed. The article is also concerned with the mutual interest of these two independent institutions and it investigates the forms and reasons for their interrelation.*



*Поступила в редакцию 4.06.2003*